# Аляксандр Лукашэнка ў рамках рэспубліканскага суботніка прыме ўдзел у будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сёння ў рамках рэспубліканскага суботніка возьме ўдзел у будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.**

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара, у складзе брыгады кіраўніка дзяржавы — кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Урал Латыпаў, міністр культуры Леанід Гуляка, старшыня Мінскага гарвыканкама Міхаіл Паўлаў, прэзідэнт канцэрна «Мінскбуд» Валерый Чычурын, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі, службовыя асобы Адміністрацыі Прэзідэнта.

Узвядзенне новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі вядзецца з 1 лістапада 2002 года. У аснову праекта пакладзена ідэя размяшчэння ў цэнтры бібліятэкі 20-павярховага кнігасховішча ў форме шматгранніка. Такое тэхналагічнае рашэнне дасць магчымасць забяспечыць суперкампактнае захоўванне і дастаўку дакументаў у найкарацейшыя тэрміны.

Да верасня 2005 года чакаецца завяршэнне новага высокатэхналагічнага, аснашчанага самай сучаснай аўтаматызаванай сістэмай будынка Нацыянальнай бібліятэкі — інтэлектуальнага інфармацыйнага цэнтра краіны.

**Марыя АГАФОНАВА, БЕЛТА.**